*суток описал поэт? Это ночь или уже поздний вечер? Что можно сказать об окне: закрыто или открыто? Расскажите, какая картинка у вас получилась? Я прочту строчку ещё раз, а вы разместите её каждый на своём экране*».

Для подобной работы на уроке необходимо выделить время. Но в результате школьники легче воссоздают в памяти описываемую картину, легче запоминают не только текст, но и орфографический облик слов, работа выполняется более осмысленно, в том числе и более слабыми учащимися. В ходе эксперимента мы в этом убедились: при записи прозаического текста орфографические ошибки были допущены только двумя учащимися (8,7 %), причём в словах традиционного написания.

Данный приём результативен и с точки зрения развития речи обучающихся, формирования знаний в области лексики — практическое усвоение слова в переносном значении. Важна также и роль живой беседы, в которой каждый может услышать мнения других, что-то дополнить, добавить, уточнить, создать собственную яркую картинку.

Для того чтобы данная работа проводилась системно, привлечение «*мысленного экрана*» можно увязать с изучаемыми на уроке орфографическими темами. Так, при изучении гласных после шипящих — «*А фея в платье из пушинки заваривает чай в кувшинке*». При изучении проверяемых согласных — «*Незнакомка раскрывает синий глаз, и росинка в нём сверкает, как алмаз*».

Можем отметить, что предлагаемые учителями тексты содержат как статичные картины (включается один «кадр»), так и динамичные — в воображении учащихся предстают несколько «кадров», которые они размещают на своих мысленных экранах. Если вначале учитель может акцентировать внимание в основном на зрительном восприятии с помощью подобранного текста, то постепенно целесообразно опираться на умения услышать, почувствовать происходящее: «*Сладкой подводной травой и ольховым корнем, осенним ветром и рассыпанным песком пахла вода из ручья. Я почувствовал в ней голос лесных гроз*». Безусловно, подобный подход учителя к выбору текстов для письма по памяти помогает учащимся ощутить красоту речи, легко запомнить и грамотно записать предложенный текст, что формирует и развивает орфографическую зоркость младших школьников.

**Заключение.** Применение в образовательной практике приёма воссоздающего воображения способствует развитию речевой индивидуальности учащихся, долговременной памяти. С другой стороны, происходит накопление языкового материала для сочинений, так как учителем организуется одновременно работа по усвоению изобразительных средств языка. Память учащихся опирается на живую яркую картину, помогает выработке устойчивых орфографических умений.

**Список цитируемых источников**

1. Учебные программы по учебным предметам для учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания. II класс. — Минск : НИО, 2016. — 156 с.
2. *Фомин, М. М.* Проблема формирования поликультурной языковой личности / М. М. Фомин // Вестн. ЯГУ. — 2007. — № 2. — С. 84—86.
3. *Политова, Н. И.* Развитие речи учащихся начальных классов / Н. И. Политова. — М., 1984. — 137 с.
4. *Гвинджилия, О. В.* Как научиться «видеть невидимое» / О. В. Гвинджилия // Нач. шк. плюс. — 2008. — № 8. — С. 39—42.

УДК 821.161.3Караткевіч[3]

**А. С. Гушча**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

## АСАБЛІВАСЦІ ТВОРЧАГА СТЫЛЮ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА

**Уводзіны.** Мастацкае засваенне свету на сучасным этапе характарызуецца спасціжэннем глыбінь і новых абсягаў, яго матэрыяльных і духоўных праяў пры разнастайнасці стылявога выяўлення, форм увасаблення задуманага. Найбольш аб'ёмна і ўсебакова творчыя пошукі ў гэтым кірунку адбіліся ў жанры рамана, асаблівыя поспехі якога прыпадаюць на 60—80 гады XX стагоддзя. Разам з традыцыйным для беларускай літаратуры сацыяльна-бытавым раманам пачынаюць плённа выкарыстоўвацца і іншыя тыпалагічныя разнавіднасці гэтай структуры, у чым асабліва пераконвае проза У. Караткевіча, якая прынесла яму шырокае прызнанне далёка за яе межамі [1, с. 104].

**Асноўная частка.** Прыход у беларускую літаратуру такога пісьменніка, як Караткевіч, быў «заканамерным і абумоўлены працэсам развіцця самой літаратуры, а таксама ўзроўнем і грамадскага, і духоўнага жыцця той эпохі, якая нарадзіла мастака» [2, с. 70].

[3] © Гушча А. С., 2020



Репозиторий БарГУ

Даследчык С. Андраюк наступным чынам акрэслівае асаблівасці творчага падыходу У. Караткевіча: «Ён з тых першаадкрывальнікаў, першапраходцаў, якіх усё захапляе сваёй веліччу, незвычайнасцю, якіх усё моцна хвалюе, узбуджае фантазію, абвастрае мастацкі зрок. Гэтае захапленне, непасрэднасць паэтычнага ўражання імкнецца ён перадаць чытачу... Караткевіч даследуе, але ў найбольшай ступені ўзнаўляе, паэтызуе гераічнае мінулае народа, выхоўвае любоў да слаўных нацыянальных традыцый. Адсюль творчая манера, у якой арганічна спалучаецца грунтоўны сацыяльны аналіз, дакладнае ўзнаўленне і паэтызацыя. Стыль вылучаецца моцнай рамантычнай афарбоўкай. Больш таго, рамантычнасць адчуваецца ў выбары незвычайных, часам выключных сітуацый і падзей, у сюжэтабудаванні, увядзенні ў твор элемента "таямнічага", якому, праўда, у рэшце рэшт надаецца чыста рэалістычнае вытлумачэнне, у моцнай эмацыянальнай насычанасці мовы, багатым выкарыстанні фальклору. Увогуле вуснапаэтычная народная творчасць у Караткевіча займае асаблівае месца. Да гісторыі ў сваёй творчасці ён ішоў ад фальклору — паданняў, легенд, песень... Пазней пануючым у творчасці пісьменніка становіцца момант сацыяльна-аналітычны і філасофскі. Але і тут прысутнасць пачатку вуснапаэтычнага адчуваецца даволі моцна» [3, с. 4].

Філосаф У. Конан адзначае такую грань пісьменніцкага таленту Караткевіча, як яго важкі ўклад ва ўзбагачэнне літаратурнай мовы за кошт шырокага засваення «залатых россыпаў народнай лексікі, якая некалі актыўна бытавала» [2, с. 15].

Даследчык жыццёвага шляху і творчасці пісьменніка А. Верабей параўноўвае ролю У. Караткевіча ў беларускай літаратуры з роляй В. Скота ў англійскай і Г. Сянкевіча ў польскай і асабліва адзначае яго заслугу ў стварэнні высокамастацкай гістарычнай прозы [2].

Уладзімір Караткевіч вядомы ў беларускай літаратуры як празаік, паэт, драматург, сцэнарыст, публіцыст, перакладчык, літаратурны крытык. Але перш за ўсё ён заснавальнік нацыянальнага гістарычнага рамана. Яго намаганнямі беларуская гістарычная аповесць, раман сталі папулярнымі жанрамі літаратуры. Пры гэтым гістарычныя творы У. Караткевіча ўнікальныя па сваіх жанравых характарыстыках. Гістарычны матэрыял часта ўваходзіць у творы з выразна выяўленымі прыкметамі іншых жанраў (прыгодніцкай, дэтэктыўнай літаратуры), і такім чынам утвараюцца спецыфічныя аўтарскія жанравыя формы. У творах пісьменніка гісторыя непасрэдна судакранаецца і ўступае ў дыялог з сучаснасцю, яна актуалізуецца ў свядомасці і ўчынках герояў-сучаснікаў.

Мастацкаму ўвасабленню гістарычных падзей прысвяціў У. Караткевіч раманы «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», «Каласы пад сярпом тваім», «Чорны замак Альшанскі», «Леаніды не вернуцца да Зямлі», аповесць «Дзікае паляванне караля Стаха». Са старонак гэтых твораў паўстаюць змагары за народнае шчасце, прарокі, інтэлігенты, рыцары і прыгонныя, каардыналы і чароўнай прыгажосці дзяўчаты. І ў кожным творы — эпоха, складаны і часам трагічны лёс Белай Русі, народ, які не скарыўся перад нястачамі і прагне волі. Пісьменнік дасканала ведаў гісторыю свайго краю, якая стала арганічнай часткай яго духоўнага жыцця. Творы выдатнага мастака слова не толькі паглыбляюць нашы веды па гісторыі, але і вучаць любіць і берагчы чалавечнае ў чалавеку, змагацца з бездухоўнасцю, знаходзіць ідэальнае і гарманічнае ў жыцці і прыродзе.

У сваіх гістарычных і дэтэктыўных жанрах аўтар ставіў і імкнуўся вырашыць агульначалавечыя праблемы жыцця і смерці, дабра і зла. У той жа час гэта «надзвычай нацыянальны пісьменнік, што выразна адчуваецца ў адным з самых папулярных яго твораў, гістарычна-дэтэктыўнай аповесці "Дзікае паляванне караля Стаха"» [2, с. 195]. У гэтым творы пісьменнік асудзіў сацыяльны прыгнёт, тыранію, уціск і дэспатызм, увасобленыя ў дзікім паляванні, якое наганяе жах як на Надзею Яноўскую, уладальніцу маёнтка Балотныя Яліны, так і на сялян у акрузе. Адначасова ў аповесці ставяцца вечныя пытанні аб прызначэнні чалавека на зямлі, аб сутнасці ягонага жыцця і любові да радзімы, паказваецца вялікае, прыгожае і чыстае каханне.

Аповесць «Дзікае паляванне караля Стаха» — гэта мастацкі прысуд Уладзіміра Караткевіча мясцовай шляхце, якая з цягам часу выерадзілася з высакароднага, рыцарскага класа ў праслойку бессаромных эксплуататараў. Для яе ўжо няма нічога святога, у імя нажывы яе прадстаўнікі ў XIX стагоддзі гатовы былі на ашуканства і махлярства, нават высакароднае і велічнае мінулае народа яны маглі запляміць і паставіць на службу карысці.

Як і належыць прыгодніцка-дэтэктыўнай аповесці, «Дзікае паляванне караля Стаха» ўвесь час трымае чытача ў напружанні. Аднак твор успрымаецца не толькі як прыгодніцка-дэтэктыўны. Аповесць Караткевіча абуджае роздум аб прызначэнні чалавека, лёсе беларускага народа, узаемасувязі розных гістарычных эпох, іскваімі рысамі набліжаецца да твораў сацыяльна-філасофскіх: яна не толькі забаўляе сваёй складанай інтрыгай, але і павучае, выхоўвае.

Гісторыя і культура чалавецтва ў паэтычным свеце Караткевіча цесна спалучаюцца з быццём і самаўсведамленнем уласнага народа, і ажыццяўляецца гэта спалучанасць праз асабовасць адчуванняў, індывідуальнае ўспрыманне творцы.

Даследчыкі (А. Л. Верабей, Г. В. Лябёдка, А. У. Русецкі, В. К. Шынкарэнка і інш.) лічаць, што творчасць У. Караткевіча, па сутнасці, уяўляе сабой у многім спробу рэканструкцыі такога роду эпічнасці, у якой выяўляецца народны менталітэт і народная эстэтыка, паўстае ў гераізаваным абліччы народны ідэал. Ажыццяўленне такой маштабнай задачы вымагала ўжывання спецыфічных падыходаў,

выкарыстання адпаведнай паэтыкі. Таму цалкам натуральным і заканамерным з'яўляецца зварот пісьменніка да сродкаў мастацкай экспрэсіі, уласцівых рамантызму.

Пры стварэнні мастацкіх вобразаў пісьменнік часцей за ўсё карыстаецца выдумкай, адвольным, часта інтуітыўным выбарам прыёмаў і сродкаў псіхалагічных характарыстык, спосабаў самавыяўлення герояў. На думку А. Мальдзіса, у тых выпадках, калі У. Караткевіч звяртаецца да гістарычна канкрэтных фактаў і асоб, ён «дапускае толькі такую разнавіднасць катэгорыі магчымага, як домысел. Дзякуючы яму на аснове няпоўнага, частковага ці нават гіпатэтычнага ведання здабываецца яго поўны ці неабходны для перакананаўчага ўспрымання аб'ём. Без дасягнення гарманічнай раўнавагі ўзнікае парушэнне жанравых законаў гістарычнага рамана, зараждаецца сумненне ў верагоднасці яго рэальна-фактычнай асновы» [4, с. 45].

**Заключэнне.** Зварот У. Караткевіча да гістарычнага матэрыялу значна ўзбагаціў беларускую літаратуру ў ідэйна-тэматычных і жанравых адносінах. Уладзімір Караткевіч — адна з найбольш яркіх фігур у беларускай літаратуры другой паловы XX стагоддзя. Яго таленавітасць, глыбокая эрудзіраванасць, патрыятызм з'явіліся той асновай, на якой грунтуюцца творчыя здабыткі пісьменніка. Творы выдатнага мастака слова не толькі паглыбляюць нашы веды па гісторыі, але і вучаць любіць і берагчы чалавечнае ў чалавеку, змагацца з бездухоўнасцю, знаходзіць ідэальнае і гарманічнае ў жыцці і прыродзе.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. *Шынкарэнка, В. К.* Пад ветразем дабра і прыгажосці: жанрава-стылявыя асаблівасці прозы У. Караткевіча / В. К. Шынкарэнка. — Мінск : Навука і тэхніка, 1995. — 175 с.
2. *Верабей, А.* Абуджаная памяць : нарыс жыцця і творчасці У. Караткевіча / А. Верабей. — Мінск : Маст. літ., 1997. — 256 с.
3. *Каваленка, В.* Аблічча мінулага: праўда і вымысел : аб творчасці У. Караткевіча / В. Каваленка. — Мінск : Маст. літ., 1987. — 230 с.
4. *Мальдзіс, А.* Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча: партрэт пісьменніка і чалавека / А. Мальдзіс. — Мінск : Маст. літ., 1990. — 230 с.


УДК 821.161.3:82-1Каратынскі

**Д. С. Доўнар**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

## ЛЕКСІЧНЫЯ СРОДКІ Ў ПЕЙЗАЖНАЙ ЛІРЫЦЫ ВІНЦЭСЯ КАРАТЫНСКАГА

**Уводзіны.** Лексічныя сродкі выразнасці выступаюць асноўным спосабам раскрыцця вобразаў у паэтычных творах. Яны дапамагаюць лаканічна, трапна, дакладна раскрыць аўтарскую ідэю. Асабліва важным сродкам яны з'яўляюцца ў тэкстах пейзажнай лірыкі.

**Асноўная частка**. Пейзаж — малюнкі прыроды, апісанне ў літаратурным творы розных мясцовасцей (горад, вёска, чыгунка) [4, с. 495]. Троп — слова ці моўны выраз, ужытыя ў пераносным значэнні [4, с. 72].

Сустракаюцца тропы ў маўленні, літаратурнай мове ўвогуле, але найчасцей — у мове мастацкай літаратуры, асабліва ў паэзіі, дзе назіраецца своеасаблівая іх канцэнтрацыя. Дапамагаюць у вобразнай і лаканічнай форме выявіць сутнасць з'явы, індывідуалізаваць яе, даць ёй ацэнку.

Тропы — не «акраса», а адзін са спосабаў вобразнага пазнання жыцця, яны ўзбагачаюць літаратурную мову новымі сэнсавымі адценнямі. Таму не дзіўна, што паэты адчуваюць арганічную патрэбу ў тропах [4].

Адрозніваюць два тыпы тропаў: 1) простыя — эпітэт, параўнанне; 2) складаныя — метафара, адухаўленне, увасабленне, сінестазія, аксімаран, метанімія, сінекдаха, гіпербала, літота, іронія, алегорыя, сімвал, гратэск, перыфраза, антанамазія, эўфемізм, апастрофа, ідыёма, зваротная метафарызацыя, паэтычны этымалагізм.

Пры відавочным, часам нават значным адрозненні розных відаў тропаў для ўсіх іх характэрна адна агульная рыса — арыентаванасць у словах не на першаснае, прамое значэнне, а на пераноснае.

У беларускай паэзіі склаліся даўнія і значныя традыцыі ў адлюстраванні прыроды, яна выпрацавала сваю сістэму важнейшых прынцыпаў выяўленчасці і поглядаў на мастацтва пейзажу.

Пейзажная творчасць з'яўляецца высокай, сапраўды эфектыўнай формай мастацкага самараскрыцця асобы і выяўлення адносінаў да навакольнай рэчаіснасці. У дачыненні да паэтычнага пейзажу можна

© Доўнар Д. С., 2020



Рэпозиторий БарГУ